**Наш** сучаснік // Ленінская іскра (Сянно). — 1988. — 5 сак. — С. 1.

## НАШ СУЧАСНІК



Яшчэ ў Багушэўскай сярэдняй школе № 1 Станіслаў Рэкуць пачаў займацца ваеннай падрыхтоўкай, не прапускаў розных спаборніцтваў. Усё гэта дало магчымасць добра падрыхтавацца да службы ў радах Узброеных Сіл СССР. Таму і праходзіла яна добра, хаця, трэба сказаць, у незвычайных умовах. Станіславу давялося несці службу ў Афганістане. Што і казаць, не вельмі проста ўсё было. Але хлопец з гонарам выканаў свой інтэрнацыянальны абавязак. Неаднаразова ў яго адрас гучалі словы ўдзячнасці ад камандавання часці за добрасумленнае нясенне службы. Карыстаўся ён павагай і аўтарытэтам і сярод сваіх аднагодак.

Пасля службы ў радах Савецкай Арміі Станіслаў Рэкуць завязаў свой лёс с Віцебскім тэлевізійным заводам, дзе ён цяпер працуе. І працуе на сумленне.

**На здымку: Станіслаў Рэкуць**

**Фота М. Зязюліна**